Панядзелак, 18 Кастрычнік 2021

# На тры гады калоніі асудзілі віцябляніна за замыканне чыгуначнага святлафора

Друкаваць (/news/sud/item/4226-na-try-gady-kalonii-asudzili-zhykhara-vitsebska-za-zamykanne-chygunachnaga-svetlafora?tmpl=component&print=1)
Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=1427fe9f94781f37278d58802e8d3bb492cb8d67)

Ацаніць гэты матэрыял (6 галасоў)



(/media/k2/items/cache/a57c70015d2955d086d93bb809131cc5_XL.jpg)

**Суд Віцебскага раёну прызнаў 41-гадовага Сяргея Іванова вінаватым у прывядзенні ў непрыдатны стан сродкаў чыгуначнага транспарту, шляхоў спалучэння, сродкаў сігналізацыі (ч.1 арт. 309 КК) ды ў замаху на такія дзеянні (ч.1 арт. 14 КК) і пакараў яго пазбаўленнем волі на тры гады.**

Справу разбірала суддзя **Таццяна Лабацкая**.

Падчас судовага следства **Сяргей Іваноў** прызнаў толькі адзін эпізод, які нібыта ўчыніў пад уплывам асабістых матываў - страты дзіцяці: паехаў на сваёй таксоўцы ў лес і пры дапамозе дроту закараціў рэйкавы ланцуг. Па іншых эпізодах віну не прызнаў. Заявіў, што сам сябе абгаварыў падчас следства.

У сваіх дзеяннях раскаяўся. Прызнаўся, што і не падазраваў, што можа быць прыцягнуты да крымінальнай адказнасці, спадзяваўся выйсці на волю пасля суду.

Прысуд не набыў законнай моцы. У Іванова ёсць магчымасць абскардзіць рашэнне ў Віцебскім абласным судзе.

*Міхась Пісараў*

Апублікавана ў Суд (/news/sud)

Тэгі: калёнія (/itemlist/tag/калёнія) чыгунка (/itemlist/tag/чыгунка) Сяргей Іваноў (/itemlist/tag/Сяргей%20Іваноў)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « Салдату, які ў красавіку ўцёк на грузавіку ў самаволку, прысудзілі 7 гадоў калоніі (/news/sud/item/4224-7-gadou-kalonii) За абразы, пагрозы гвалту і паклёп на сілавікоў у Полацку судзяць ураджэнку Узбекістану » (/news/sud/item/4230-za-abrazy-pagrozy-gvaltu-i-pakljop-na-silavikou-u-polatsku-sudzyats-uradzhenku-uzbekistanu)

Вярнуцца ў пачатак (/news/sud/item/4226-na-try-gady-kalonii-asudzili-zhykhara-vitsebska-za-zamykanne-chygunachnaga-svetlafora#startOfPageId4226)

© 2011 - 2023 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/Ht